УДК 811.161.3’42’373.2:398:27-468.6(=161.3)

**С. А. Вяргеенка** (Гомель)

# ПРЫРОДНА-ЛАНДШАФТНЫЯ МІФАЛАГЕМЫ Ў ПАЭТЫЧНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСКІХ ЗАМОЎ

Актуальнасць вывучэння прыродна-ландшафтных вобразаў-міфалагем абумоўлена тым, што гэтыя аб’екты, стыхіі з’яўляюцца не толькі тым асяроддзем, дзе пражывае і гаспадарыць чалавек, але і тым, што яны ў значнай ступені фарміруюць светапогляд, менталітэт і этнакультурныя традыцыі народа. Да таго ж элементы ландшафтна-геаграфічнага асяроддзя з’яўляюцца ключавымі элементамі, якія фарміруюць адметную выяву свету беларуса-палешука. Такімі ключавымі элементамі ў міфалагічнай (па прыродзе сваёй) канфігурацыі свету выступаюць **вадаёмы**. Тэматычная група міфалагем, якая суадносіцца з рэаліямі палескага ландшафтнага асяроддзя, надзвычай дэталізаваная: акіян, мора, рэкі, ручаі, азёры, крыніцы, балоты, калодзежы і інш. Культ вады – адзін з самых архаічных, і на працягу ўсяго жыцця чалавека ад нараджэння і да смерці застаецца і сакральным, і эстэтычным арыенцірам, замацаваным у побытавых практыках, абрадах, прыкметах, павер’ях, загадках, замовах. І гэта не выпадкова, калі ўлічыць, што вада – самае пашыранае рэчыва на планеце Зямля. Сусветны акіян займае прыблізна 80 % ( дакладней 70,8 %) паверхні планеты, а калі дадаць яшчэ вадаёмы сушы, падземныя воды, леднікі, то карціна атрымаецца настолькі ўнушальная, што па справядлівасці планету варта было б называць не Зямля, а Вада.

Вада – гэта першааснова жыцця, адзін з універсальных вобразаў-сімвалаў традыцыйнай міфалагічна-народнай канцэпцыі будовы свету. Першаступеннае значэнне ключавых, знакавых вобразаў – у іх функцыянальнай напоўненасці. У гэтай сувязі важнымі з’яўляюцца такія характарыстычныя адзнакі вады, як характар руху (рухомая, быстрая, марудная, стаячая), бяспечная ці небяспечная, чыстая ці брудная і г.д. У міфалагічных уяўленнях нашых старажытных продкаў усё значна прасцей: вада можа быць або жывой, або мёртвай. Мёртвая вада – гэта стаячая, брудная, і ў такім плане яна нясе негатыўную інфармацыю. У замоўным жанры акіян, мора, балота – вада стаячая, непазнаная, гэта мяжа паміж “гэтым” і “тым” светам, населеным інтэрнальнымі істотамі і хваробамі. Гэта першазданная стыхія хаоса, што адназначна ўспрымалася патэнцыяльнай пагрозай. І ў той жа час мору-акіяну “приписывается способность порождать всё сущее на земле и саму землю…” [1, с. 281]. Наш старажытны продак ведаў, што зямля нарадзілася ў моры-акіяне і ўтрымліваецца “на трох кітах, трох кіціцах” (запісана ў в. Забалоцце Акцябрскага р-на ад Ахрамчык Н. М.) або, як мяркуе І. С. Каленчукоў з в. Зябраўка Гомельскага р-на, “свет (зямля – С. В.) трымаецца на трох сланах”, што ўпісваецца ў традыцыйнае касмаганічнае ўяўленне нашых старажытных аўтараў і замаўляльнікаў. Сама ж хаатычная, непрадказальная стыхія мора-акіяна, насылаючы розныя хваробы, якія жылі ў іх глыбінях, несла чалавеку пакуты і смерць. Бараніцца ад гэтых шкаданосных хвароб можна было выпрабаваным сродкам – абрадам замаўлення, адправіўшы агрэсараў на іх прывычнае месца жыхарства. Менавіта туды, у гіблае месца, адсылаюцца хваробы. Так, Л. А. Еўжанка з г. Хойнікі ссылае рожу “…у далёкія

краі…, глыбокія моры, дзе людзі не ходзяць, дзе месяц не свеціць і сонца не грэе”, а гэта значыць, гэтая прастора адназначна хаатычная, варожая. І ўжо зусім адкрытым тэкстам Е. І. Матарас з г. Тураў Жыткавіцкага р-на адсылае порчу, якую на чалавека насылае “чорт-сатана”, туды, “дзе трава не расце, дзе сонца не грэе, дзе вецер не вее, ідзі ў бездну, на дно”, туды, дзе і гаспадарыць “князь тьмы” – сатана.

Этнапрастору палескага краю найперш характарызуе топкае\мокрае балота – дамінантная прыродная стыхія, якую з поўным правам можна разглядаць як адзін з архетыпаў і адну з асноўных міфалагем замоўнага жанру. Ва ўсведамленні старажытнага чалавека спрадвеку замацавалася стэрэатыпная ацэнка і адпаведныя адносіны да балота як да параджэння Чарнабога, стыхіі таямнічай, хаатычнай, населенай экстранальнымі істотамі (багнік, балотнік, чэрці, хваробы). Таму зусім не выпадкова ў замове “Ад зубнога болю”, запісанай у в. Краснае Брагінскага р-на ад Скідан Г. К., зубны боль адсылаецца “ў сухія ляскі ды ў мокрае балота”, бо хвароба “прыйшла ад чорта, а не з неба”. Сваімі вобразамі і складнікамі структуры замова выяўляе вытокі старажытнай дыхатаміі “дабро\ліха”, “неба\зямля(балота)”, “верх\ніз”, “Бог\чорт”; “ад чорта”, чытай, з балота – месца знаходжання нячысціка, адпаведна “з неба” – месца знаходжання боскіх сіл. Адпраўляючы хваробу ў балота, замаўляльнік-гуманіст не знішчае яе фізічна, што было б зусім лагічна, каб хвароба больш нікому не пашкодзіла, а вяртае на месца пастаяннага яе жыцця. Што гэта так, пераконвае фрагмент замовы “Ад скулы”, запісанай у в. Уборак Лоеўскага р-на ад Пятровай Н. І., дзе замаўляльнік звяртаецца да хваробы: “Скула-скуліца, ідзі за высокія горы, на сухія ляса, на топкія балата, там твае дзеткі, там цябе іх расціць, паіць, гадаваць і да канца века дажываць”. Як бачым, ва ўяўленні нашых продкаў, хваробы, як і іншыя насельнікі прыроды, жывуць такім жа жыццём, як і людзі: вядуць гаспадарку, маюць сям’ю, росцяць і выхоўваюць дзяцей і г.д. А гэта значыць, што зададзены з часоў першатварэння рытм і ўклад жыцця працягваецца і прыклад усяму – сусветнавядомая нябесная іерагамія: Неба-бацька і Зямля-маці, дзе каб Маць-сыра зямля нарадзіла і вырасціла ўсё жывое, Бацька-неба павінен аплadніць яе нябесным малаком-дажджом.

Жывая вада – гэта вада чыстая, гаючая, праточная. Найперш адзначым прынцыпова важную акалічнасць, што семантычны блок “ісці”, “цекчы”, “плыць” у міфалагічнай свядомасці адносіцца толькі да вады і больш не ўжываецца ні з адным элементам прыроднага ландшафту: “Шлі тры ракі: адна вадзяная, другая мядовая, трэцяя крававая…” (запісана ў в. Стараград Кармянскага р-на ад Тарасенка З. П.), або “Вадзіца-травіца па мору хадзіла, пясочак сеяла…” (запісана ў в. Бібікі Мазырскага р-на ад Дарошка В. Я.), ці “Цякло тры рэчанькі…” (запісана ў в. Ручное Лельчыцкага р-на ад Семянко Г. П.).

Вобраз вады адназначна характарызуецца яскрава выражанай амбівалентнасцю. З аднаго боку, гэта жыццядайная стваральная сіла (пачатак жыцця), з другога – асацыіруецца з разбуральнымі праявамі прыродных сіл (сусветны патоп, які згубіў усё жывое, апрача таго, хто вырataваўся на каўчэгу). Але ж патоп – гэта і ачышчэнне зямлі ад грахоўнага бруду. Дарэчы, яшчэ з дахрысціянскіх часоў наш прашчур верыў у ачышчальную і гаючую сілу вады. Маніпуляцыі з вадой падчас лекавання-замаўлення скіравана на магічнае ачышчэнне ад хваробы. Так, рытуальнае замаўленне вады даволі шырока практыкавалася ад розных хвароб, напрыклад, ад пухліны (“На груди было вот такое яйцо… Она мне сказала, чтоб я с дому привезла воду. Потом я пила эту воду и мылась вся,

добавляла эту воду даже в ванну. В течение месяца я к бабушке ходила три раза до захода солнца" [2, с. 38, № 79]), ад зглазу ("Чытаюць на воду, якой пояць і ўмываюць бального" [2, с. 52, № 138]; "Калі ў рабёнка разгарэўся твар, і ён плача без прычыны, тады маці западозрывае, што гэта "сглаз", умывае яго вадой і выцірае сваёй сарочкаю..." [2, с. 52, № 135]), ад храпу ("Патрэбна чытаць замову на ваду альбо малако. Замаўляюць ваду (малако) раніцай пад абразом. Даюць піць яе храпуну тры разы на дзень" [2, с. 75, № 245]), для палягчэння родаў ("Затым на чатыры вуглы стала наліць свячонай вады. Цяжарная жанчына павінна выпіць гэтую ваду вуснамі, трымаючы рукі за спіною" [2, с. 74, № 244]), ад хваробы дзяцей ("Берут ковшик, искупавши ребенка, ставят его на ножки и, ополаскивая, пока льется вода из ковшика, говорят эти слова. Говорится три раза, три раза поливается" [2, с. 54, № 141]), ад спалоху, неўрозу ("Нагаварыць на ваду. Ёй пояць і ўмываюць бальнога" [2, с. 51, № 133]) і інш.

Рытуальнае абціранне, абмыванне, змыванне паганай энергетыкі, зліванне вады над хворым у працэсе замаўлення, выпіванне загаворанай вады мела станоўчыя вынікі, вяло да пазбаўлення ад пакуты, да аднаўлення сіл. Яшчэ адным магічным спосабам замацавання рытуальнага дзеяння і вербальна-тэкставай магіі было сплёўванне, якім часта заканчваўся рытуал лекавання. Так, Н. І. Дземянкова, 1923 г. н., з в. Патапаўка Буда-Кашалёўскага р-на раіла "Пасля кожнай замовы (а ў яе калекцыі 19 адзінак – С. В.) падуць на чалавека і сплюнуць праз левае плячо. Затым паўтарыць яшчэ раз, сплюнуць два разы, падуць трэці раз, сплюнуць тры разы" [2, с. 29, № 42]. Пры лекаванні "Ад апёку" М. М. Цярэшчанка, 1931 г. н., з в. Засінцы Ельскага р-на здзяйсняе наступны рытуал: "Плююць на апёк і чэрцяць вакол апёку тры разы безымянным пальцам", а затым чытае замову "Госпадзі Ісусе Хрісце, помілуй нас. Зоря от зорі, маё слово от огня, мої слюні от болі" [2, с. 52, № 137].

Найчасцей інфарматары паведамляюць, што напрыканцы лекавання трэба "дзевяць раз дунуць і плюнуць праз левае плячо" [2, с. 108, № 409]. Л. В. Прыходзька, 1939 г. н., з в. Мялешкавічы Лельчыцкага р-на раіла пасля прамаўлення замовы "Ад ляку" (а яшчэ "Падвей", "Ад ляка") "Вымаўляць на сходніх днях у мужскі дзень (панядзелак, аўторак, чацверг, нядзеля) перад сном, каля іконы, адзін раз замову і тры разы «Отче наш», пры гэтым сплёўваць тры разы цераз плячо" [2, с. 109, № 415].

Наогул трэба адзначыць, што ва ўсходніх славян прамаўленне лекавай замовы звычайна і заканчвалася "сплёўваннем праз левае плячо", бо паводле народных уяўленняў, па-першае, на левым плячы знаходзіцца анёл-спакуснік, па-другое, сліна, як і іншыя выдзяленні чалавечага цела, здаўна лічылася нячыстасцю, брудам. Таму такое дзеянне тлумачылася негатыўным стаўленнем ці да "цёмнага анёла", ці да хваробы, ці да чаго-небудзь небяспечнага. Негатыўная семантыка сліны і плявання захавалася і ў наш час, напрыклад, у зняважлівых (слюнцяй, смаркач і да т.п.) або ў фразеалагічных адзінках "цьфу на цябе", "пляваць мне на што-небудзь", якія выражаюць знявагу, абыякавасць, незадаволенасць. Дэманструючы падобнае стаўленне да злога, небяспечнага духа, замаўляльнік імкнуўся пазбавіцца ад яго. Такі прынцып уздзеяння – пакрыўдзіць агрэсара-хваробу – у замовах назіраецца даволі часта: "Ячмень-дурак, не садзісь тут так, а ідзі ты ў поле, у сіне морэ" [3, с. 259, № 1016], або "залатуха – злая старуха, адстань ад рабы (імя)" [3, с. 203, № 755], ці "лішай, лішай, лішавіна, твая маць – жыдавіна, твая маць – свіння, парасятам цыцкі не дала. У рабы Божай (імя) лішая няма" [3, с. 20, № 9] і многія іншыя. Гэтыя і падобныя сітуацыйныя зняважлівыя дзеянні

ўваходзілі і ў замовы і дайшлі да нашага часу як старадаўняя спадчына анімістычна-фальклорнага мыслення і як традыцыя далетапісных вякоў (мы і цяпер, каб не "зглазіць", не перашкодзіць лішнім, не ў час сказаным словам, гаворым "сплюнь цераз левае плячо", і то і тройчы сімвалічна сплёўваем, або тройчы стукаем па драўляным прадмеце). Менавіта з перасцярогай не нашкодзіць, не абразіць сакральную існасць існуе цэлы шэраг забарон. Так, нельга пляваць на зямлю, на агонь, каб не пакрыўдзіць, не выказаць гэтым сваім учынкам знявагу да жыццядайнай стыхіі. Як бачым, у гэтай іпастасі сліна (як вадкасць) асацыіруецца з негатыўнай характарыстыкай, што яшчэ раз можа пацвердзіць дуалістычныя ўяўленні нашага продка пры мадэляванні народнай карціны свету, дзе вада заняла сваё адметнае месца і прадстала ў розных іпастасях: гэта і жывая – гуллівая, ачышчальна-гаючая, і разбуральна-знішчальная стыхія. Гэта і ўлонне, дзе нараджаецца і без чаго не можа існаваць усё жывое, і мяжа паміж жывым і мёртвым, і адначасова стыхія "гэтага" і "таго" свету, населеная найчасцей пачварамі, варожымі чалавеку (вадзянік, балотнік, нячыстыя духі, хваробы і інш.). Думаецца, не будзе перабольшваннем, калі сказаць, што ні адзін з прыродных архетыпаў у замоўным жанры не прадстаўлены так шматбакова, як вада.

У структуры міфапаэтычнай мадэлі свету адным з базавых элементаў прасторава-ландшафтнага кода з'яўляецца **лес** – прастора, да якой спрадвеку паляшук (чалавек, што жыве па-лесе) ставіўся насцярожана, надзяляючы яе магічнымі ўласцівасцямі. Тут яшчэ трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што чалавеку прыходзілася ў прамым сэнсе слова адваёўваць у леса прастору і для пражывання, і для вядзення гаспадаркі. Сімволіка леса-пушчы звязана з дыхатаміяй "хаос\космас", дзе яна хутчэй набывае, што больш лагічна, апазіцыю "прырода\культура". У дадзеным кантэксце лес успрымаецца хаатычнай прасторай, гэта месца лакалізацыі дзікіх жывёл і дзікарослых раслін, якія непадуладныя чалавеку, гэта і прытулак небяспечных сіл-духаў. Сімвалічны статус лесу рэпрэзентуе перш за ўсё ягоны гаспадар лесавік "найбольш велічны" (А. Е. Багдановіч). Ва ўяўленні нашага старажытнага продка лясун – непрадказальная, амбівалентная істота: ён мог і пакараць чалавека, які нечым парушае агульнапрынятыя правілы паводзін у лесе, мог "пашуткаваць", напрыклад, збіць з дарогі, завесці ў гушчар лесу, напужаць, з'явіўшыся перад ім у розных абліччах, але часта і дапамагаў – ягадніку паказваў дарогу да ягаднай паляны, а грыбніка вёў да грыбных мясцін. Ведаючы гэта, паляшук, каб наладзіць прыязныя стасункі з гаспадаром лесу, браў для яго з сабой падарункі, прамаўляў замовы, імкнуўся паводзіць сябе ў лесе ціха і прыстойна, маўляў: "у чужы манастыр са сваімі правіламі не ходзяць". Так і жыхар Петрыкаўшчыны П. У. Казіміраў пры наведванні леса прамаўляе замову "Ад лесуна": "Хаджу па лясах, па кустах, па імхах, па балотах, па лыкадзёрах, па чарніцах, па малінах – куды не хаджу, ніколі не блуджу, сонца па сонцу, месяц па месяцу, пры частых зорках, пры вячэрніх зорах хаджу, не блуджу, а табе, лясны хазяін, пакорнасць аддам, ад мяне, раба, адматніся, у бярозу абярніся. Амінь" (вар. ад А. П. Чырыч, 1933 г. н. з в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на.; в. Верхняя Алба Жлобінскага р-на ад Н. А. Канаваленка, 1933 г. н.). Г. Р. Сядая, 1925 г. н., з в. Краўцоўка Гомельскага р-на расказвае: "Перад тым, як ісці ў лес, трэба на пень пакласці хлеб і прагаварыць замову, каб задобрыць гаспадара лесу: «Іду ў лес, бяру хлеб і соль і нясу ляснному хазяіну…»".

І ўсё ж лясун – гэта міфалагічная істота, але лес быў густа абжыты мноствам рэальных насельнікаў: звяры, птушкі, паўзуны і многія іншыя, якія маглі пашко-

дзіць чалавеку. Ад іх прымяняліся тыя ж засцерагальныя дзействы – ахвяраванне ў сукупнасці з замовай. Так і нашы інфарматары з в. Ляда Лагойскага р-на Г. К. Навіцкая, 1961 г. н., і К. І. Пятроўская, 1931 г. н., замову “Ад укусу змяі” папярэдне суправаджалі падарункам: “Когда идёшь в лес, берешь с собой кусок хлеба и ложишь его под куст и семь раз читаешь молитву. Тогда ты вообще не встретишь змею”.

Не толькі лясныя “жыхары” і сам лес, але і кожнае **дрэва** нашымі продкамі надзялялася адметнымі ўласцівасцямі і звышнатуральнай сілай уздзеяння на чалавека. Нашы продкі-язычнікі абагаўлялі дрэва. Таму зусім прадказальна, што дрэва займае выключнае месца нават у такім сакральным жанры, як замова. У дэндралагічным кульце найбольш прадстаўнічым, а значыць і частотным, з’яўляецца цар-волат дуб. Ён не толькі характэрная адзнака палескіх краявідаў, але і той магутны эмацыянальна-псіхалагічны фактар, які актыўна ўздзейнічае на лад жыцця, характар мыслення аўтэхтоннага насельніцтва, яго душэўны стан, духоўны вопыт, гэта дамінантны вобраз-сімвал ягонага міфалагічна-старажытнага свету, сімвал даўгалецця, мудрасці, жыццястойкасці. Дуб у міфалогіях многіх народаў суадносіўся з вярхоўнымі бостваміі (Зеўс, Юпітэр, Пярун – богі-грамавікі). Велічны дуб з архаічных часоў набыў статус “Сусветнага дрэва”, якое структуруе касмічную прастору: сваімі каранямі абдымае апраметную, “той” свет, вершалінай трымае неба, а ствол – “гэты\белы\Божы” свет. “Сусветнае дрэва” – гэта свайго роду сакральны цэнтр свету, “пуп” зямлі, падмурак, апора космасу, які выступае і як вобраз, і як прынцып касмічнай арганізацыі і парадку. Так па прынцыпу “Сусветнага дрэва” ў замоўным жанры структуруецца сакральна-міфалагічны цэнтр (М. Ц.) у замовах.

Такім чынам, разгледжаныя прыродна-ландшафтныя вобразы-міфалагемы дапамагаюць асэнсаваць светапоглядныя ўяўленні нашых продкаў, якія склаліся ў далетапісныя часы, выявіць пэўную заканамернасць і стадыяльную абумоўленасць ва ўзнікненні вобразаў-сімвалаў, якія захоўваюцца не толькі ў пасіўнай памяці, але і актыўна выкарыстоўваюцца ў паўсядзённых практыках.

ЛІТАРАТУРА

1. Словарь символов и знаков / авт.-сост. Н. Н. Рогалевич. – Мінск. : Харвест, 2004. – 512 с.

2. *Вяргеенка, С. А.* “На моры-акіяне, на востраве Буяне…” (лекавыя замовы Гомельшчыны): фальклорна-этнаграфічны зборнік / С. А. Вяргеенка; пад рэд. В. С. Новак; М-ва адукацыі РБ, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 220 с.

3. «Гаючае слова роднай зямлі» (беларускія лекавыя замовы). Фальклорна-этнаграфічны зборнік / аўтар уступнага артыкула, аўтар-укладальнік Вяргеенка С. А. – Гомель : Барк, 2013. – 340 с.